ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ
па правядзенні выбараў
у Каардынацыйную Раду III склікання

**РАШЭННЕ**
па скарзе зацікаўленай асобы
на дзеянні кандыдата спіса выбарчага суб’екта

20 траўня 2024 года г. Варашава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду III склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разгледзіўшы на пасяджэнні скаргу ад ініцыятара выбарчага спіса “Закон і правапарадак” Аляксандра Азарава,

**ВЫЗНАЧЫЛА:**

17 траўня 2024 года ў 17:41 (CET) на адрас Выбарчай камісіі паступіла скарга ад заяўніка – ініцыятара выбарчага спіса “Закон і правапарадак” Аляксандра Азарава. Заяўнік лічыць, што ў адносінах да яго былі ўчынены неэтычныя дзеянні з боку прадстаўніка выбарчага суб’екта “Воля” Максіма Дзенісевіча падчас эфіра “Еўрарадыё” 17 траўня 2024 года. У скарзе прыведзены наступныя словы, якія, паводле заяўніка былі вымаўлены Максімам Дзенісевічам у бок Аляксандра Азарава: “его осталось только добить”; “странно, что такие люди вообще баллотируются”. Гэтыя выказванні заяўнік лічыць зняважлівымі і негатыўнымі, і, адпаведна, паводзіны прадстаўніка выбарчага суб’екта “Воля” недапушчальнымі і неэтычнымі, у сувязі з чым просіць прыняць меры рэагавання.

18 траўня 2024 года ў 07:44 (CET) Выбарчая камісія накіравала на адрас Аляксандра Азарава ліст з просьбай удакладніць довады скаргі да 12:00 гадзін (CET) 20 траўня 2024 года, а менавіта даслаць адказы на наступныя пытанні:

- *у якую хвіліну і секунду на відэазапісе па якой спасылцы гучыць рэпліка "странно, что такие люди вообще баллотируются";*
- *што абразлівага Вы лічыце ў словах "странно, что такие люди вообще баллотируются"?*
- *у адпаведнасці з якімі палажэннямі Кодэкса этыкі КР ([https://rada.vision/etychny-kodeks-kaardynacyjnaj-rady](https://rada.vision/etychny-kodeks-kaardynacyjnaj-rady)) Вы лічыце паводзіны прадстаўніка выбарчага суб'екта "Воля" неэтычнымі?*

На момант разгляду скаргі 17:00 (CET) 20 траўня 2024 года інфармацыя, аб удакладненні якой прасіла Выбарчая камісія, з боку Аляксандра Азарава не паступіла.

Прааналізаваўшы змест скаргі, Выбарчая камісія прыходзіць да высновы аб неабходнасці высвятлення наступных абставінаў:

1) ці сапраўды адбываўся эфір Еўрарадыё, пра які сцвярджае заяўнік?
2) ці сапраўды Максімам Дзенісевічам вымаўлены прыведзеныя вышэй словы? Калі так, то ці былі гэтыя словы вымаўлены ў дачыненні да Аляксандра Азарава?
3) ці парушаюць гэтыя выказванні этычныя патрабаванні да ўдзельнікаў выбарчага працэсу?

1. Заяўнік не палічыў патрэбным указаць спасылку на інтэрнэт-рэсурс або больш дэталёвую інфармацыю аб відэазапісе, у якім дапушчана меркаванае парушэнне. Тым не менш, Выбарчая Камісія самастойна правяла аналіз відэаматэрыялаў, размешчаных у публічным доступе, і прыйшла да высновы, што заяўнік мае на ўвазе эфір на YouTube-канале "Еўрарадыё" ад 17.05.2024:

- рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=xpjulAKvZiA;
- час і дата доступу: 07:03 (CET) 18 траўня 2024 года.

Дадзены эфір уяўляе сабой дэбаты кандыдатаў на выбарах у КР III-га склікання. Сярод удзельнікаў праграмы выяўлены Максім Дзенісевіч – прадстаўнік выбарчага суб’екта "Воля".

Такім чынам, Выбарчая камісія прыходзіць да высновы аб спраўджанасці факта трансляцыі дэбатаў каныдатаў, пра якія адзначаецца ў скарзе.

2. Заяўнік сцвярджае, што Максім Дзенісевіч прамовіў наступныя словы:

- "его осталось только добить";
- "странно, что такие люди вообще баллотируются".

Даследаваўшы праграму цалкам і прааналізаваўшы сказанае кандыдатам Максімам Дзенісевічам, Выбарчая камісія выявіла толькі адно выказванне, змест якога падобны да выкладзенага у скарзе Аляксандрам Азаравым (час на відэа 27:16 – 27:32):

*"Што датычыцца іншага, то таксама. Мы бачым у спісах і людзей, якія займаліся махлярствам, мінімум па тры разы. Мы бачым таго ж Азарава. Так, вось па-чалавечы мне яго шкада і не хочацца яго дабіваць, бо яго сапраўды засталося дабіць".*

Гэтае выказванне закранае асобу Аляксандра Азарава, у сувязі з чым, падлягае ацэнцы Камісіі на прадмет дапушчальнасці і этычнасці паводзінаў кандыдата.

Што тычыцца словаў "странно, что такие люди вообще баллотируются" – Выбарчая камісія такога выказвання не выявіла. Сам жа Аляксандр Азараў на просьбу Камісіі даслаць звесткі пра дакладны час адпаведнага выказвання ніяк не адрэагаваў. Такім чынам, Выбарчая камісія прыходзіць да высновы аб неадпаведнасці рэчаіснасці акалічнасці, выкладзенай Аляксандрам Азаравым у скарзе.

3. Заяўнік не палічыў патрэбным указваць у скарзе, якія этычныя нормы парушыў Максім Дзенісевіч сваім выказваннем, датычным Аляксандра Азарава. Просьба Камісіі выкласці адпаведную норму Кодэкса этыкі Каардынацыйнай рады заяўнікам была праігнаравана.

Зыходзячы з падпункта 3.2.5. пункта 3 і падпункта 6.1.7. пункта 6 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года (далей - Палажэнне), абавязковай умовай удзелу кандыдатаў у выбарчым працэсе з’яўляецца наяўнасць згоды выконваць патрабаванні Мемарандума аб прынцыпах і правілах удзелу ў выбарчай кампаніі ў Каардынацыйную раду Беларусі (далей - Мемарандум), выкладзенага ў дадатку 1 да Палажэння.

Кожны кандыдат на этапе рэгістрацыі выбарчага суб’екта і працэдуры верыфікацыі кандыдатаў выбарчага спісу даў пісьмовую згоду трымацца Мемарандума.

У Мемарандуме заяўляецца аб згодзе з правіламі правядзення выбарчай кампаніі ў Каардынацыйную раду Беларусі трэцяга складу ў 2024 годзе і прыняцці абавязкаў выконваць гэтыя правілы, у прыватнасці, выконваць этычныя і камунікатыўныя нормы і правілы падчас правядзення агітацыі і публічных выступаў, у тым ліку правілы Этычнага Кодэкса Каардынацыйная рады (далей – Этычны кодэкс КР).

Згодна з падпунктам 2.7 пункта 2 Этычнага Кодэкса КР у сваіх публікацыях у сацсетках, адносінах з медыя і шырокай грамадскасцю дэлегаты і дэлегаткі устрымліваюцца ад любой дэзінфармацыі, абразлівых заяваў, маніпулявання і імкнуцца да максімальнай адкрытасці, якая, аднак, можа абмяжоўвацца меркаваннямі этыкі і бяспекі.

У адпаведнасці з падпунктам 2.9 пункта 2 Этычнага Кодэкса КР дэлегаты і дэлегаткі усведамляюць, што выкарыстанне гумару, іроніі, саціры і сарказму з’яўляецца неад’емнай часткай палітычнай камунікацыі, аднак мусяць разумець дапушчальны дыяпазон паміж гэтымі інструментамі і прамой абразай, парушэннямі персанальнай прасторы і ўмяшальніцтвам у прыватнае жыццё або наўмыснай дыскрэдытацыяй.

Прааналізаваўшы выказванне Максіма Дзенісевіча, Выбарчая камісія не знайшла ў яго ных словах прамой або ўскоснай **абразы** Аляксандра Азарава. Максім Дзенісевіч не ўжывае ў прамове эпітэты ці назоўнікі, якія могуць прыніжаць гонар і годнасць палітычнага канкурэнта. Больш таго, ужытыя ім дзеясловы (“не хочацца яго дабіваць”, “засталося дабіць”) не сведчаць аб рэальным намеры здзейсніць неправамерны ўчынак, з прычыны чаго такое выказванне ў якасці недапушчальных паводзін не разглядаецца.

Што тычыцца аналізу інтэнцый вымаўленага кандыдатам у эфіры, Выбарчая камісія адзначае наступнае: Максім Дзенісевіч выказвае спачуванне Аляксандру Азараву, хаця і не патлумачыўшы, чым яно выклікана. Тым самым, на думку Выбарчай камісіі, такое выказванне гіпатэтычна можа быць кваліфікавана як маніпулятыўнае, паколькі словы Максіма Дзенісевіча ўспрымаюцца неаднасэнсоўна: маўляў, існуюць звесткі, якія могуць істотна нанесці шкоду рэпутацыі Аляксандра Азарава,

але яго настолькі шкада, што Максім Дзенісевіч, нягледзячы на палітычную канкурэнцыю, устрымаўся ад магчымасці прынізіць апанента. Разам з тым, Выбарчая камісія не мае дастатковых і дакладных звестак, якія дазволілі б адназначна прыйсці да такой высновы.

Аналізуючы сказанае Максімам Дзенісевічам у кантэксце, Выбарчая камісія лічыць відавочным (у тым ліку для большасці слухачоў), што мела месца агаворка (моўная памылка) ў словах кандыдата: выказванне “бо яго сапраўды засталося дабіць” належыць разумець не ў якасці аксіёмы або інструкцыі да дзеянняў, а як няправільна аформленую і выказаную думку, якая, верагодна, мусіла мець іншы сэнсавы змест – “бо яго сапраўды амаль няма чаго дабіваць”.

Што тычыцца довада скаргі аб наяўнасці **негатыўнага выказвання** з боку Максіма Дзенісевіча – дадзеная акалічнасць не мае значэння для ацэнкі паводзінаў кандыдата на прадмет адпавядання правілам этыкі. Адмоўнае стаўленне, негатыўная крытыка, нязгода з пазіцыяй апанента з’яўляецца натуральнай з’явай у палітычных працэсах і адпавядае праву на свабоду выказвання меркавання.

Такім чынам, Выбарчая камісія не лічыць слушнымі довады заяўніка аб недапушчальнасці і неэтычнасці дзеянняў кандыдата выбарчага суб’екта “Воля” Максіма Дзенісевіча праз наяўнасць у яго выступе абразлівых і негатыўных выказванняў. Кіруючыся падпунктамі 4.9-4.12 пункта 4 Палажэння, Выбарчай камісіяй

**ВЫРАШАНА:**

У здавальненні скаргі ініцыятара спіса кандыдатаў выбарчага суб’екта “Закон і правапарадак” Аляксандра Азарава – адмовіць.

Паведаміць заяўніку, што рашэнне Выбарчай камісіі можа быць паўторна абскарджана ў тэрмін 24 гадзіны з моманту яго атрымання.

Выбарчая камісія А. Прыходзька (старшыня)